# НАЦЫЯНАЛЬНАЯ І СУСВЕТНАЯ КУЛЬТУРА

*Асобы*

## ЗДАТНЫ ПАЛЯШУК

### ДА 150-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ АЛЯКСАНДРА СЕРЖПУТОЎСКАГА

*Жыў сабе адзін вельмі здатны палешук. Много ён хадзіў па сьвету, мо на сем міль у акрузе, много ўселякаго дзіва бачыў. Дзівіліса людзі, як яго галава зносіць, як яно там месьціцца. Разумны быў ён і да ўсяго здатны.*

Са зборніка “Казкі і апавяданні беларусаў Слуцкага павету” А. Сержпутоўскага.



*21 чэрвеня 2014 г. спаўняецца 150 гадоў з дня нараджэння выдатнага беларускага этнографа, фалькларыста, мовазнаўцы і публіцыста Аляксандра Казіміравіча Сержпутоўскага (1864 – 1940).*

Шлях Аляксандра Сержпутоўскага ў вялікае жыццё і навуку быў тыповым для беларускай нацыянальнай інтэлігенцыі канца ХІХ – пачатку ХХ ст. Ён пачаўся ў сям’і малазямельнага беларускага селяніна са Слуцкага павета Мінскай губерні і праз народнае вучылішча і Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю прывёў А. Сержпутоўскага, як і многіх здольных юнакоў таго часу, на пасаду настаўніка народнага вучылішча. У школах Мазырскага і Слуцкага паветаў Мінскай губерні ён адпрацаваў дзевяць гадоў, непасрэдна назіраючы за жыццём люду беларускага Палесся.

У 32-гадовым узросце А. Сержпутоўскі меў ужо дастаткова жыццёвага досведу для рашучага пачатку новай старонкі біяграфіі. У 1896 г. ён пераехаў у сталіцу і пачаў вучыцца адначасова ў Пецярбургскім археалагічным інстытуце і на Вышэйшых юрыдычных курсах. З 1906 г. пасля заканчэння інстытута ўсё яго жыццё было звязана з этнаграфічным аддзелам Рускага музея, у фарміраванне фондаў якога А. Сержпутоўскі ўклаў дзесяцігоддзі працы.

Мы не ставім мэты акрэсліць усе сферы дзейнасці гэтага надзвычай плённага збіральніка і даследчыка. Ды гэта і немагчыма ў межах аднаго артыкула. Адзначым толькі, што сярод усіх навуковых зацікаўленняў А. Сержпутоўскага галоўнае месца належала Беларусі і беларускай народнай культуры. Ён неаднаразова вяртаўся сюды падчас экспедыцый этнаграфічнага аддзела Рускага музея і збіраў багаты палявы матэрыял.

Неўзабаве пасля пачатку вучобы выйшаў першы нарыс – “Беларусы-палешукі” (1908), дзе будучы этнограф спрабуе свае сілы ў апісанні архітэктуры, побыту, звычаяў і вераванняў сялян Мазыршчыны і Случчыны. У 1907 – 1909 гг. на старонках часопіса “Живая старина” друкаваліся нарысы А. Сержпутоўскага “Сябрына”, “Толока”, “Бонда”, “Добывание огня”, “Колтун”, “Ловля вьюнов” і іншыя, што сёння складаюць залаты фонд нарадазнаўчых матэрыялаў. Узорам змястоўнага стылю даследчыка служыць адзін з першых нарысаў гэтай серыі – “О завитках в Белоруссии” (1907), дзе апісваецца рас-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

паўсюджаная на Случчыне магічная практыка нанясення шкоды праз жыта. Ён чытаецца з вялікай цікавасцю, дае магчымасць зазірнуць у таямнічы свет народнага чарадзейства. Аб'екты, атрыбуты і прыёмы вясковых чараўнікоў – усё гэта А. Сержпутоўскі падае ў арганічным кантэксце народнага жыцця. Аўтар узгадвае аднаго з носьбітаў традыцыі – селяніна в. Чудзін Івана Санюка па мянушцы Порца, які валодаў, як казалі людзі, вялікай сілай адрабляць заломкі ці завіткі. Увага да асобы інфарматара, бачанне ў ім індывідуальнасці стане ў далейшым адзнакай аўтарскага збіральніцкага стылю А. Сержпутоўскага. Пазней ён апіша многіх таленавітых апавядальнікаў з народа, сваіх інфарматараў, за якімі ў фалькларыстыцы замацуецца найменне "казачнікі Сержпутоўскага". Гэта – дзяды Рэдкі, Сасноўскі, Болбат, Савіцкі, дзядзькі Даніла Кулеш, Лявон Лябедзік, Азёмша; апавядалі А. Сержпутоўскаму і жанчыны – старая Бохмачыха, шляхцянка Умінская і іншыя [5, с. 31 – 34].

Неабходна адзначыць унёсак даследчыка ў вывучэнне беларускай мовы, якую ён лічыў самастойнай славянскай мовай. Лінгвістычныя нататкі збіральнік пачаў рабіць задоўга да пераезду ў Санкт-Пецярбург. У 1911 г. ён апублікаваў нарыс "Грамматический очерк белорусского наречия дер. Чудина Слуцкого уезда Минской губернии", у якім прыводзіў звесткі пра фанетыку, граматыку, сінтаксіс беларускай мовы. Вялікую цікавасць уяўляе раздзел "Матэрыялы для слоўніка", дзе лексіка размеркавана па тэматычных групах, сярод якіх назвы ступеняў роднасці, званняў, саслоўяў; назвы прадметаў побыту, прылад працы і працоўных працэсаў; назвы адзінак ліку, меры і вагі; элементаў касцюма, а таксама зычэнні, ласкальныя і лаянкавыя выразы. У прадмове А. Сержпутоўскі паведамляў, што пражыў у Мінскай губерні каля 30 гадоў. З цеплынёй сына сваёй зямлі ён апісвае родную вёску Чудзін, якая стаіць на беразе ракі Лань за 50 вёрстаў ад Слуцка. Чудзін і ваколіцы, ва ўспамінах Сержпутоўскага, – старажытныя паселішчы, дзе пануе традыцыйны лад жыцця і традыцыйныя заняткі. "Тут, – пісаў аўтар, – больш, чым у іншых месцах, захаваліся рысы народнай гаворкі, старыя звычаі, павер'і і ўсе асаблівасці простага жыцця палешука-беларуса, які моцна трымаецца свайго дзядоўскага і вельмі неахвотна ўспрымае новае" [4, с. 2].

Менавіта мову лічыў А. Сержпутоўскі адным з галоўных этнавызначальных фактараў. Па накіраванні Інбелкульта ў 1926 г., правадзейным сябрам якога ён стаў у 1925 г., вучоны здзейсніў экспедыцыю ў Гомельскую губерню для "вызначэння этнаграфічнай мяжы беларускай народнасці і мовы з суседнімі велікарускімі і ўкраінскімі плямёнамі". У справаздачы па выніках гэтай экспедыцыі ён дакладна перадае асаблівасці мовы гомельска-чарнігаўска-бранскага памежжа і сцвярджае, што "пачынаючы ад р. Дзясны каля Почапа ў Бранскай губерні па ўсёй тэрыторыі Гомельскай губерні ўздоўж р. Іпуці з паўднёвага боку і да Гомеля жыве ўласна беларускае насельніцтва, таму што характар яго пасяленняў, пабудоў, мовы, усяго гаспадарчага і хатняга быту ясна сведчыць пра гэта" [6, с. 16]. Гэтыя працы атрымалі высокую ацэнку акадэмікаў А. Шахматава і Я. Карскага.

Акрамя мовазнаўчых прац, найкаштоўнейшая частка спадчыны даследчыка – публікацыі беларускай народнай прозы: "Сказки и рассказы белорусов-палешуков" (1911), "Казкі і апавяданьні беларусаў з Слуцкага павету" (1926). Зборнік "Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў" (1930) змяшчае надзвычай каштоўныя ў навуковым сэнсе апісанні вераванняў, самабытных звычаяў і абрадавых практык жыхароў гэтага ўнікальнага гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна. Не цалкам захаваліся парэміяграфічныя працы даследчыка, напісаныя па матэрыялах са Случчыны і Мазыршчыны (1908 і 1912 гг.).

Зборнік 1911 г. стаў наватарскай з'явай у тагачаснай фалькларыстыцы. Вострая сатырычная скіраванасць сюжэтаў, выразнае сацыяльнае гучанне казак А. Сержпутоўскага разбуралі стэрэатып пра фальклор беларусаў як выключна архаічны, не здольны да эвалюцыі. "Першае і самае галоўнае, – піша У. Касько, – што адрознівала калекцыю казак Сержпутоўскага ад папярэдніх публікацый, – гэта новы падыход да збірання і вывучэння казачнай прозы беларусаў. Аляксандр Казіміравіч першым звярнуў увагу на новыя з'явы ў фальклоры, якія ўзніклі ў сувязі са зменамі ў жыцці беларускай вёскі канца XIX – пачатку XX стагоддзя. Аб гэтым сведчыць тое значнае месца, якое займаюць у зборніку вострыя па сваёй палітычнай і сатырычнай накіраванасці творы" [2, с. 6]. Збіральніцкая канцэпцыя А. Сержпутоўскага была прагрэсіўнай, бо грунтавалася на дэмакратычных сацыяльных перакананнях укладальніка. Гэтая канцэпцыя пярэчыла пашыранай у фалькларыстыцы пачатку XX ст. устаноўцы, паводле якой лічылася, што чым больш архаічны тэкст, тым ён больш каштоўны. Але, як паказаў час, каштоўная не толькі архаіка. Многае з сабранага А. Сержпутоўскім, а найперш казкі, маюць высокую мастацкую і навуковую вартасць. Яны ўключаны ў тамы БНТ, фальклорныя зборнікі, хрэстама-

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

тыі, а таксама шырока выдаюцца ў літаратурнай апрацоўцы.

Як ужо адзначалася, цэлы перыяд жыцця вучонага з 1906 да 1930 гг. звязаны з этнаграфічным аддзелам Рускага музея ў Санкт-Пецярбургу. Менавіта тады разгортвалася яго вялікая экспедыцыйная дзейнасць. У 1910 г. адзін з даследчыцкіх шляхоў пралягаў на далёкі Каўказ, дзе А. Сержпутоўскі зафіксаваў вельмі каштоўны матэрыял. У прыватнасці ім даследавана і дакументальна пацверджана існаванне ўнікальных малакалькасных этнасаў, апісана іх матэрыяльная культура, звычаі, традыцыі і фальклор. А. Сержпутоўскі набываў для фондаў музея значную колькасць прадметаў з цяжкадаступных горных раёнаў, а яго фотаздымкі, зробленыя на Каўказе, сёння складаюць неацэнны скарб дакументальнай гісторыі народаў гэтага рэгіёна [3, с. 60].

З экспедыцый 1906 – 1910 гг. па Мінскай, Гродзенскай і Валынскай губернях А. Сержпутоўскі прывозіў адзенне, узоры народнага тэкстылю, земляробчыя прылады, музычныя, бандарныя інструменты, сродкі палявання і значную колькасць фотаздымкаў, на якіх – аблічча беларускіх сялян, сцэны сялянскага быту, пабудовы і прамысловыя заняткі жыхароў Палесся.

У рукапіснай працы “Полешуки-белорусы. Этнографический очерк” абагульнены вынік экспедыцый 1906 – 1910 гг. у Мазырскі павет Мінскай губерні (сёння – Лунінецкі р-н Брэсцкай вобл.). Праз некалькі гадоў гэты рэгіён быў даследаваны таксама І. Сербавым. Матэрыялы Сержпутоўскага і Сербава (тыпы сядзібнай забудовы, планіроўка, інтэр’ер сялянскага жытла) далі каштоўную фактычную аснову для сучасных этнографаў. Здзейсненая па тых жа месцах праз сто гадоў экспедыцыя супрацоўнікаў акадэмічнага інстытута дазволіла прасачыць шляхі эвалюцыі архітэктуры сялянскага жытла ў вёсках Заходняга Палесся [1, с. 66].

Сёння асоба і навуковая спадчына Аляксандра Казіміравіча Сержпутоўскага асэнсаваны ў навуцы і засвоены ў культурнай практыцы. Пра А. Сержпутоўскага і яго даследаванні ў розныя часы пісалі І. Поліўка, В. Бандарчык, І. Германовіч, М. Грынблат, А. Фядосік, Л. Бараг, К. Кабашнікаў. Самы значны ўнёсак у даследаванне біяграфіі, навуковай і грамадскай дзейнасці, а таксама лёсу навуковай спадчыны нашага славутага збіральніка належыць У. Касько.

Уладзімір Касько падрыхтаваў да перавыдання працы А. Сержпутоўскага, якія разам з біяграфічным нарысам і фальклорна-этнаграфічнымі каментарамі склалі выданне ў чатырох кнігах серыі “Повязь вякоў”: “Святло далёкай зоркі” (1997), “Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў” (1998), “Сказки и рассказы белорусов-палешуков” (1999), “Казкі і апавяданні беларусаў Слуцкага павета” (2000). Пазней з’явіўся ўкладзены У. Касько зборнік парэмій “Палескі дзівасіл: Беларускія народныя прыказкі, прымаўкі, выслоўі: са скарбніцы А. Сержпутоўскага” (2005).

Аднак сучасным навукоўцам для даследавання застаецца нямала з навуковага задзелу, зробленага Аляксандрам Казіміравічам Сержпутоўскім. Паводле У. Касько, даследчык паспеў напісаць 45 вялікіх навуковых прац. Вядомы як спецыяліст па традыцыйнай культуры і фальклоры Беларускага Палесся, А. Сержпутоўскі вывучаў таксама бытавыя асаблівасці палякаў, украінцаў, рускіх, татараў, народаў Каўказа. Яго рукапісная спадчына захоўваецца ў фондах Расійскага этнаграфічнага музея, Цэнтральнага дзяржаўнага гістарычнага архіва Санкт-Пецярбурга, Расійскай дзяржаўнай бібліятэкі, Расійскай нацыянальнай бібліятэкі, Дзяржаўнага рускага музея, Інстытута рускай літаратуры (Пушкінскі дом), а таксама ў фондах Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа НАН Беларусі і Бібліятэкі Акадэміі навук Літвы імя Урублеўскіх.

### Спіс літаратуры

1. **Беляева, С. С.** Архитектурный декор народного жилья Лунинецкого района (по материалам экспедиций И. А. Сербова и А. К. Сержпутовского) / С. С. Беляева // Культура и быт белорусов в этнографических исследованиях и музейных коллекциях : материалы Междунар. науч. конф., 7 – 8 июня 2012 г., Минск / ИМЭФ НАН Беларуси. – Минск : Право и экономика, 2012. – С. 65 – 68.
2. **Касько, У. К.** Сцяжынкамі казкі / У. К. Касько // Казкі і апавяданні беларусаў-палешукоў. – Мінск : Універсітэцкае, 1999. – С. 5 – 22.
3. **Максимчик, А. Н.** Экспедиция А. К. Сержпутовского на Кавказ / А. Н. Максимчик // Этно-экономическое развитие Беларуси в XIX – начале XX в. : мат. Междунар. науч-практ. конф., 19 – 20 мая 2010 г. – Минск : Изд. центр БГУ, 2011. – С. 57 – 60.
4. **Сержпутовский, А. К.** Грамматический очерк белорусского наречия дер. Чудина Слуцкого уезда Минской губернии / А. К. Сержпутовский. – СПб. : Тип. Императорской Академии наук, 1911. – 66 с.
5. **Сержпутоўскі, А. К.** Казкі і апавяданні беларусаў Слуцкага павета / А. К. Сержпутоўскі. – Мінск : Універсітэцкае, 2000. – 270 с.
6. **Сержпутовский, А. К.** Отчет о поездке в Гомельскую губернию в 1926 году / А. К. Сержпутовский. – Менск, 1926. – 16 с.

**Настасся ГУЛАК,**
дацэнт кафедры этналогіі і фальклору
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
культуры і мастацтваў,
кандыдат філалагічных навук.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ